№29, красавік 2022 ISSN 2562-950

**Ігар Пракаповіч: Камень-інтрыган з Пастаўскага краю**

Анатацыя. Аўтар прыводзіць апісаньне вялікага валуна ў Пастаўскім краі, які яшчэ не ўзяты пад ахову, хоць па сваіх характарыстыках ён падпадае ў разрад геалагічных помнікаў прыроды. Валун атрымаў назву па прозвішчы былога гаспадара надзела зямлі, на якім знаходзіцца. Над зямлёй яго бачныя памеры складаюць 3 метры даўжыні на 2,6 метра шырыні пры вышыні да 40 сантыметраў. Паводле легенды пад гэтым каменем чорт схаваў скарб.

На Віцебшчыне знаходзіцца шмат вялікіх камянёў, якія прыцягнуў сюды ў даўнія часы са Скандынавіі ледавік. Найбуйнейшы валун, які мае даўжыню 11 метраў і шырыню 5,6 метра, ляжыць каля вёскі Горкі Шумілінскага раёна. На сённяшні дзень самым вялікім валуном у Пастаўскім раёне лічыцца Вялікі камень Заўліцкі – геалагічны помнік прыроды рэспубліканскага значэння. Ён мае даўжыню 4,50 м, шырыню – 3,80 м, вышыню – 1,70 м, абвод – 12,80 м, аб’ём – 15,40 м$^3$. Важыць гэта камлыга каля 40 тон. На ёй лёгка можа размесціцца больш дзесяці чалавек.

І вось нечакана з’явіўся камень-інтрыган, які быццам бы мае намер адабраць у Заўліцкага валуна ягонае першае месца. Хто ён такі і адкуль узяўся? Пра гэты валун расказаў і паказаў яго на полі жыхар вёскі Пруднікі Пастаўскага раёна Збігнеў Колас. Прычым, распавядаючы пра памеры, некалькі разоў паўтарыў “Ды ён чорт ведае які!” Называецца гэта камлыга “Куцухаў камень” і ляжыць яна на ўсходняй ускраіне вёскі Круткі, нязначна ўзвышаючыся над зямной паверхняй. Валун атрымаў назву па прозвішчы гаспадара надзела зямлі, на якім знаходзіцца.



*Куцухаў камень*

Пры Польшчы Куцухава ніва была вузкая, а камень ляжаў якраз поперак, таму і араць было дрэнна, і садзіць, і ўбіраць. Але найгорш – вывазіць на калёсах на поле гной. Гаспадар на суседнія надзелы пільнаваўся не заязджаць, каб звадак не было, таму колы штораз чапляліся за камень. Па просьбе Куцухі спецыялісты-стараверы спрабавалі той валун узарваць. Нарабілі ў ім дзірак, заклалі порах, заточылі вапеннымі каменьчыкамі і рванулі. Знеслі верхнюю частку валуна, таму ён цяпер мае абламаныя, вострыя краі. Але большая яго частка засталася ў зямлі.

Для таго, каб усё ж пазбавіцца ад гэтай перашкоды на ніве, Куцуха склікаў талаку. Сабраліся мужыкі, пачалі капаць каля каменя, але не далі рады. Чым глыбей капалі, тым шырэйшы рабіўся валун. Давялося засыпаць раскапаную яму ды пакінуць камень у спакоі. Так цяпер і ляжыць ён на былым полі, зарастае быллём і чакае цікаўных і дасведчаных людзей: можа і праўда гэта самы вялікі камень не толькі на Пастаўшчыне але і ў Беларусі?

Над зямлёй яго бачныя памеры складаюць 3 метры даўжыні на 2,6 метра шырыні пры вышыні да 40 сантыметраў. Валун пакуль што не ўзяты пад ахову, хоць па характарыстыках падпадае ў разрад геалагічных помнікаў прыроды. Паводле легенды пад гэтым каменем чорт схаваў скарб. Было б цікава, напэўна, паспрабаваць адкапаць той валун. На глячок з золатам і срэбрам спадзяванні невялікія, а вось памеры могуць быць “чорт ведае якія”. Можа і праўда, у нашым раёне хаваецца пакуль у зямлі самы вялікі супер-валун…

**Ihar Prakapovich: The Intriguing Stone of Pastauski Region**
***webzine “Kultura. Natsyja”, issue 29, April 2022, 189-190, www.sakavik.net)***
The author describes one large boulder that can be found in Pastauski Region which has not be recalled from protection even though, by its very properties, it continues to crumble into a series of geological monuments of Nature. The boulder was named after the surname of the past owner of the plot of land on which it stands. It stands over the ground and measures 3 metres in length by 2.6 metres in width reaching 40 centimetres in height. According to legend, the devil hid treasure under this rock.

**Игорь Прокопович: Интригующий камень в Поставском районе**
***(веб-журнал Культура. Нация», вып. 29, апрель 2022, 189-190, www.sakavik.net )***
Резюме. Автор приводит описание крупного валуна в Поставском районе, который до сих пор не взят под охрану, хотя по своим характеристикам относится к категории геологических памятников природы. Валун назван в честь бывшего владельца надела земли, на котором он расположен. Над землей его видимые размеры составляют 3 метра в длину и 2,6 метра в ширину при высоте до 40 сантиметров. Согласно легенде, под этим камнем дьявол спрятал клад.